# У НОВЫ ГОД З ДОБРЫМІ

## Вырастуць заробкі і пенсіі, павялічыцца памер

## Што яшчэ чакае беларусаў у 2025-м?

Традыцыйна Новы год пачынаецца для жыхароў краіны з важных змен. І 2025-ы не выключэнне. Сёлета навацыі закрануць як дабрабыт грамадзян розных узростаў, так і працоўныя адносіны і абыходжанне з жывёламі. Пра самыя адметныя змены — у нашым дайджэсце.

### ВЫРАСЦЕ «МІНІМАЛКА»

З 1 студзеня мінімальная зарплата ў Беларусі вырасце без малога на 100 рублёў, альбо на 16 %, у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў у 2024 годзе. Па інфармацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, «мінімалка» ў новым годзе дасягне **726 рублёў**. Нагадаем, мінімальная



зарплата ў нашай краіне — найніжэйшы парог аплаты працы. Прытрымлівацца гэтай велічыні пры аплаце працы работнікаў абавязаны ўсе без выключэння наймальнікі: суб'екты гаспадарання дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці, ІП; супрацоўнікі, з якімі заключаны працоўны дагавор. Пры гэтым у калектыўным дагаворы можа быць прапісаны больш высокі памер «мінімалкі». Галоўнае, каб не ніжэйшы.

### СТАЎКА Ў РОСТ

І яшчэ пра заробкі. Базавая стаўка для аплаты працы ў бюджэтнай сферы з 1 студзеня складае **270 рублёў**. Дагэтуль яе памер складаў 253 рублі. Апошні раз яе павялічвалі 1 верасня 2024 года. Тады яна вырасла на 6,7 %.

**Нагадаем, базавая стаўка — гэта асноўны элемент тарыфнай сістэмы, на аснове якой праводзіцца аплата працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, што атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.**

У цэлым, як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, зарплата работнікаў бюджэтнай сферы за 2025 год павінна вырасці на **15 %**.

### ДАДАТКОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Акрамя таго, з наступнага года бюджэтнікі змогуць працаваць больш і атрымліваць за гэта даплату, што прадугледжана нормамі адпаведнага ўказа Прэзідэнта. Дадатковыя абавязкі ў работніка могуць з'явіцца, толькі калі ён згодзен на такую схему. Даплата можа скласці да 100 працэнтаў зарплаты, але дакладны памер будзе вызначацца з улікам аб'ёмаў выкананай работы. Кіраўнікі бюджэтных арганізацый змогуць па ўзгадненні з прафсаюзам зацвярджаць штатную колькасць работнікаў у меншай колькасці, чым гэта вызначана нарматывамі. Такім чынам, увесь фонд зарплаты можна будзе дзяліць на меншую колькасць работнікаў, і яны змогуць атрымаць прыбаўку.

### БАЗАВЫ ПАДЫХОД

З 1 студзеня на два рублі павялічылася базавая велічыня. Цяпер яна складае **42 рублі**. Мінулы раз яна таксама мянялася з 1 студзеня. Гэты паказчык выкарыстоўваюць у якасці асновы для разліку цэлага шэрагу выплат — дапамог, стыпендый, а таксама вызначэння памераў падаткаў, збораў, штрафаў і розных пошлін. Пры гэтым стане большай дапамога па беспрацоўі. Гэта, дарэчы, адна з нямногіх выплат у Беларусі, памер якой прывязаны да базавай велічыні, а не да бюджэту пражытачнага мінімуму. Нагадаем, права на яе маюць тыя, хто быў звольнены па ўважлівай прычыне. Грашовая дапамога рэгулярна выплачваецца дзяржавай асобам, якія маюць статус беспрацоўных. Яе памер залежыць ад часу, які грамадзянін правёў без працы: максімальны — дзве базавыя велічыні, мінімальны — 70 % базавай велічыні.



### ПРАЦАВАЦЬ ВЫГАДНА

Добрая навіна для пенсіянераў, якія працягваюць працаваць. З 1 студзеня знята абмежаванне па памеры іх пенсій. Напрыклад, чалавек выйшаў на пенсію з каэфіцыентам 1,45. Згодна з заканадаўствам, да гэтага ён мог атрымліваць пенсію, працягваючы працаваць, з каэфіцыентам не больш за 1,3. Пачынаючы з 2025 года пенсія будзе поўнасцю выплачвацца, калі чалавек пенсійнага ўзросту працягвае працаваць. У некаторых пенсіянераў пенсіі вырастуць. Пры гэтым сума, якую недаатрымліваў работнік, у кожнага свая. У некаторых яна можа даходзіць нават да 500 рублёў. Для перараздзелу пенсіі не трэба кудысьці звяртацца. Мера, звязаная са зняццем абмежавання памеру пенсіі, будзе рэалізавана ў аўтаматычным рэжыме.

У цэлым жа пенсія за 2025 год павінна вырасці, паведаміла **міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА:**

— З улікам прагнозных параметраў і разлікаў плануем, што ў сярэднім за год пенсія павялічыцца на **14 %**. Яе сярэдні памер за год складзе **926 рублёў**.

Наталля Паўлючэнка адзначыла, што прадугледжваецца паэтапнае павышэнне пенсіі, будуць павялічвацца надбаўкі, даплаты да пенсій у выніку росту бюджэту пражытачнага мінімуму, з якога яны разлічваюцца.


Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Слонимский агросервис», 231800, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Строителей, 8 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (одним лотом). Месторасположение – Гродненская обл., Слонимский р-н, д. Чемеры, ул. Грибовская и Озгиновичский с/с, 27, вблизи д. Чемеры**

**Производственная база** в составе:
**гаражи** (здания специализированные автомобильного транспорта, инв. № 450/С-14806 – 404 кв. м и инв. № 450/С-14814 – 396,8 кв. м);
**административное здание** (здание административно-хозяйственное, инв. № 450/С-12729, 467,2 кв. м, составные части: двое ворот, забор, два покрытия);
**здания нежилые** (здания неустановленного назначения, инв. № 450/С-14624 – 518,4 кв. м и инв. № 450/С-14772 – 363 кв. м);
**контрольно-диспетчерский пункт** (здание специализированное иного назначения, инв. № 450/С-12762, 359,5 кв. м, составные части: навес).
**Обременение:** помещения зданий частично сданы в аренду

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 263 400,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота

***Сведения о земельных участках:***
1) общ. пл. 0,6852 га с кадастровым номером 425483307102000025, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений;
2) общ. пл. 0,3534 га с кадастровым номером 425483307102000326, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания административного здания.
Ограничения (обременения) прав на земельные участки: расположены в водоохранных зонах рек и водоемов

**Задаток 10 %** от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 15 (пятнадцать) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 05.02.2025**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 04.02.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37, +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



Информация о проведении открытого аукциона 06 февраля 2025 г. на право аренды земельного участка

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125.***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Срок аренды | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Смолевичский район, в районе г. Смолевичи | 624800000001003803 | 0,8497 | Для строительства и обслуживания производственной базы | 99 лет | 11 874,56 |
| 2 | Минская область, Смолевичский район, в районе д. Дуброва | 624800000001001150 | 7,1334 | Для строительства коттеджного комплекса | 99 лет | 185 468,40 |
| 3 | Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, д. Сосновая, ул. Придорожная, 31Б | 624883010101000674 | 0,4004 | Для строительства и обслуживания общественно-торгового центра | 99 лет | 31 741,71 |
| 4 | Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, д. Ляды, ул. Весенняя, 9А | 624883005801000177 | 0,0738 | Для строительства и обслуживания магазина и подъездной дороги к нему | 99 лет | 3 634,49 |
| 5 | Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, 33Б, вблизи д. Динаровка | 624883000018000393 | 0,7416 | Для строительства и обслуживания административно-складских зданий и сооружений | 99 лет | 32 051,90 |

Аукцион состоится **06 февраля 2025 г. в 15.00** в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу **https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/,** Смолевичского райисполкома **isp@smolevichi.gov.by,** на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 6000014139